# ВЫСТАЎКА ПРАЕКТАЎ АДБУДОВЫ МІНСКА

Учора ў бібліятэцы імені Леніна адкрылася выстаўка конкурсных праектаў па забудове цэнтра горада Мінска, некаторых жылых кварталаў, рэканструкцыі парка імені Горкага, а таксама па адбудове Рудзенскага раёна.

Па адбудове цэнтра Мінска на конкурс прадстаўлена 11 праектаў. Аўтарамі іх з'яўляюцца выдатныя зодчыя Савецкага Саюза — акадэмікі В. Н. Сямёнаў і Н. Я. Колі, члены-карэспандэнты Акадэміі архітэктуры СССР І. Н. Собалеў, М. П. Паруснікаў і другія.

У ліку 11 конкурсных праектаў прадстаўлены тры праекты, над якімі працавалі беларускія аўтары — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, кіраўнік архітэктурна-планіровачнай майстэрні І. Г. Лангбард, галоўны архітэктар горада Мінска Ю. А. Егораў і архітэктар В. М. Маргуліс, архітэктары І. Н. Рудэнка і М. Н. Андросаў.

На выстаўцы грамадскасць Мінска зможа дакладна пазнаёміцца з усімі варыянтамі праектаў, якія красамоўна гавораць аб грандыёзным размаху будаўніцтва, якое будзе праводзіцца ў сталіцы Беларусі. Тут мінчане таксама ўбачаць праекты плошчаў, асобных будынкаў, помнікаў, жылых кварталаў горада, васьмікватэрных дамоў.

У аддзеле, прысвечаным адбудове Рудзенскага раёна, ёсць праекты ўсіх населеных пунктаў, макеты будынкаў сельсаветаў і г. д.

Выстаўка конкурсных праектаў будзе працаваць 10 дзён. Пасля шырокага прагляду грамадскасцю спецыяльнае журы адобрыць адзін з варыянтаў, паводле якога і будзе весціся адбудова.

---

і 2-ім ордэнам Чырвонага Сцяга. За баявыя заслугі на франтах Айчыннай вайны ўрад ЗША ўзнагародзіў яго ордэнам «Крыж за баявыя лётныя заслугі».

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства Уладзіміру Георгіевічу Завадскаму Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза ССР ад 26 кастрычніка 1944 года прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Золотая звезда».

Цяпер Уладзімір Георгіевіч громіць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на 2-ім Украінскім фронце. Камандаванне, афіцэрскі і сяржанцкі састаў часці, у якой служыць Уладзімір Георгіевіч, прыслалі пісьмо да яго бацькоў — Георгія Фёдаравіча і Анастасіі Еўсееўны Завадскіх. У пісьме яны выказваюць шчырую падзяку бацькам-беларусам, якія ўзгадавалі і выхавалі такога воіна-патрыёта, змагара за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

«У гэтым маладым чалавеку, савецкім лётчыку, у баявой рабоце на фронце Айчыннай вайны,—пішуць яны,—праявілі-